«Поощрение, защита и осуществление прав человека в Интернете»: при принятии правительствами мер против дезинформации, дискриминации, вражды и насилия в цифровой среде не следует упускать из внимания международные обязательства по правам человека.

Развитие информационного общества позволяет упростить доступ и расширить объем многих прав граждан. Однако, эти потенциальные возможности и преимущества информационных технологий не станут реальностью сами по себе. Их реализация во многом зависит от адекватной и своевременной трансформации конституционных обязанностей государства по обозначенным выше направлениям.

**Список использованных источников**

1. Мур, Н. Права и обязанности в информационном обществе: Пер. с англ. / Н. Мур // Научные и технические библиотеки. – 1999. – №1. – С. 117.

2. Голубева, Л.А. Тенденции развития механизма государства в условиях информационного общества / Л.А. Голубева, С.С. Рудометов // Международный журнал гуманитарных и естественных наук. – 2016. – №1. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/tendentsii-razvitiya-mehanizma-gosudarstva-v-usloviyah-informatsionnogo-obschestva. – Дата доступа: 17.11.2022.

***Дашкевіч Аляксандр Леанідавіч***

# АСОБНЫЯ АСПЕКТЫ РЭАЛІЗАЦЫІ НАВЭЛАЎ КАНСТЫТУЦЫІ І РАЗВІЦЦЁ КАНЦЭПЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

дацэнт кафедры міжнароднага права, юрыдычны факультэт, установа адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі "Міжнародны ўніверсітэт "МІТСО", кандыдат гістарычных навук, дацэнт, aldminsk75@mail.ru

***Анатацыя.*** Разглядаюцца пытанні рэалізацыі канстытуцыйных норм абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у межах абмеркавання развіцця Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Уносяцца прапановы па ўдасканаленню Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, накіраваныя на выкарыстанне патэнцыялу асобных навэлаў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у дачыненні ўзаемадзеянні асобы, грамадства і дзяржавы.

***Ключавыя словы:*** канцэпцыя нацыянальнай бяспекі; канстытуцыя; сацыяльная дзяржава; грамадскія фарміраванні; навука.

Ва ўмовах канстытуцыйнага рэфармавання, з пункту гледжання алгарытму ўвасаблення канстытуцыйных навэлаў у заканадаўстве, асаблівае значэнне набывае нарматворчая дзейнасць, накіраваная на абнаўленне канцэптуальных дакументаў, якія, у сваю чаргу, вызначаюць прыярытэты ў

адпаведных сферах і галінах. У гэтым сэнсе Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, якая зацьверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 9 лістапада 2010 г. (далей – Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі), патрабуе свайго абнаўлення, як зыходзячы з неабходнасці ўліку змен і дапаўненняў, унесенных у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, так і паводле сучаснага стану і перспектыў развіцця нацыянальнай бяспекі, ва ўсёй комплекснасці і шматстайнасці яе элементаў, з захаваннем пераемнасці, што актуалізуецца і на дзяржаўным узроўні [1].

Сутнасць змяненняў Канстытуцыі, як лічыць старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь П.П. Міклашэвіч, складаецца ў наступным: захаванне прэзідэнцкай формы праўлення (адначасова выказваецца меркаванне аб захаванні рэспублікі змешанага тыпу з узмоцненай прэзідэнцкай уладай [2, с. 3]) з пераразмеркаваннем паўнамоцтваў Прэзідэнта, Парламента і Урада, грунтуючыся на іх канстытуцыйных функцыях; устанаўленне канстытуцыйнага статусу Усебеларускага народнага сходу як вышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя, які вызначае стратэгічныя напрамкі развіцця грамадства і дзяржавы, што забяспечвае непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду; удасканаленне канстытуцыйных асноў выбарчай сістэмы, вызначэнне канстытуцыйнага статусу Цэнтральнай выбарчай камісіі; развіццё і змястоўнае напаўненне, канстытуцыйных палажэнняў аб сацыяльным характары беларускай дзяржавы ў выглядзе ўзмацнення гарантый сацыяльных правоў; пашыраны гарантыі судовай абароны правоў грамадзян праз устанаўленне паўнамоцтва Канстытуцыйнага Суда па разглядзе канстытуцыйных скаргаў грамадзян на парушэнне іх правоў і свабод [3, с. 68-69].

Развіваючы прыведзенае меркаванне, звернем увагу на асобныя канстытуцыйныя палажэнні аб сацыяльным характары беларускай дзяржавы. Патэнцыял навэлаў, у дадзеным выпадку, разлічаны не толькі на пераемнасць, але і на адпаведную трансфармацыю, як зместу, так і сістэмы канстытуцыйных прынцыпаў, на якіх заснавана ўзаемадзеянне асобы, грамадства і дзяржавы.

Сацыяльны характар беларускай дзяржавы выступае ў якасці кампанента канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, роля якога, у сістэме ўсіх элементаў, значна павышаецца. Грунтуючыся на зменах і дапаўненнях, якія ўнесены ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, спалучая асновавытворныя палажэнні канстытуцыйнага ладу і прававога статуса асобы, з нормамі аб адпаведных правах і свабодах, абавязках асобы (ч. 1 арт. 4, ч. 1 арт. 5, ч 3 артыкулы 21 і інш.), забеспячэнне сацыяльнага партнёрства і сацыяльнай адказнасці, сацыяльнай справядлівасці і салідарнасці, выступае ў якасці вызначальных індыкатараў грамадскага дабрабыту.

З улікам ацэнкі знешніх і ўнутраных пагроз нацыянальнай бяспецы, у аснове ўказаных прынцыпаў знаходзіцца сацыяльная эфектыўнасць. Дадзены прынцып актыўна выкарыстоўваецца пры правядзенні сацыяльнай палітыкі і адносна іншых сфер жыццядзейнасці, рэалізуецца ва ўсіх важнейшых кампанентах сацыяльна-працоўнай сферы, уключая забеспячэнне дастойнага

ўзроўню жыцця, рэалізацыю права на працу і дастойны ўзровень яго аплаты, сацыяльную абарону, сацыяльную арыентаванасць рынкавай эканомікі і шэрагу іншых.

Базавы характар гэтага палажэння актуальны для ўсіх суб’ектаў, якія ўдзельнічаюць у грамадскіх адносінах, вызначая параметры і суадноснасць адпаведнай дзейнасці з канстытуцыйнымі каштоўнасцямі, як дзяржаўных органаў, так і прафесійных саюзаў, грамадскіх аб’яднанняў, іншых грамадскіх фарміраванняў, як устаноў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, навукі, адукацыі, культуры і іншых некамерцыйных арганізацый, так і суб'ектаў гаспадарання, незалежна ад формы ўласнасці.

Палажэнне аб сацыяльнай адказнасці прадстаўлена ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, у тым ліку, у рамках прынцыпу захавання балансу інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы, іх узаемнай адказнасці. Прынцыпы салідарнасці і сацыяльнай эфектыўнасці не атрымалі неабходнага замацавання, што, па нашаму меркаванню, патрабуе ўключэння іх у пералік прынцыпаў забеспячэння нацыянальнай бяспекі, выкладзеных у ч. 1 п. 48 дзеючай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі.

Тым больш, што ў бягучым заканадаўстве, у прыватнасці, палажэнне аб сацыяльнай эфектыўнасці, актыўна выкарыстоўваецца. У прыклад можна прывесці Палажэнне аб парадку функцыянавання адзінай сістэмы дзяржаўнай навуковай і дзяржаўнай навукова – тэхнічнай эспертызы, зацьверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 мая 2015 г., дзе сацыяльная эфектыўнасць выступае ў якасці аднаго з крытэрыяў пры правядзенні дзяржаўнай навуковай і дзяржаўнай навукова-тэхнічнай экспертызы.

У сацыяльна - працоўнай сферы ключавая роля належыць прафесійным саюзам, якія павінны ажыццяўляць абарону і рэалізацыю працоўных, сацыяльна-эканамічных правоў і інтарэсаў, што ставіць пытанне аб замацаванні іх удзелу ў прававых механізмах па рэалізацыі прынцыпу сацыяльнай эфектыўнасці на канцэптуальным узроўні з далейшай дэталізацыяй, пры неабходнасці, у бягучым заканадаўстве.

Згодна з ч. 1 арт. 5, ч. 3 арт. 21 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прадугледжана, што, з аднаго боку, палітычныя партыі і іншыя грамадскія аб'яднанні, у тым ліку, прафесійныя саюзы, садзейнічаюць рэалізацыі і абароне правоў, свабод і інтарэсаў чалавека і грамадзяніна, з другога, кожны павінен праяўляць сацыяльную адказнасць, уносіць пасільны уклад у развіццё грамадства і дзяржавы. Прафесар Р.А. Васілевіч адносна дапаўнення арт. 21 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь адзначае, што ў межах абмеркавання ў Канстытуцыйнай камісіі выказвалася прапанова аб замацаванні нормы аб тым, што кожны павінен працаваць [4, с. 17], якая, як бачна, не трапіла ў тэкст зменаў і дапаўненняў.

Неабходна стымуляваць удзел як асобы, так і грамадскіх фарміраванняў, у тым ліку, улічваючы асаблівую ролю прафесійных саюзаў, у дзейнасці накіраванай на вырашэнне сацыяльна значных задач у галіне стварэння

неабходных умоў, садзейнічання падрыхтоўцы навуковых кадраў у кантэксце забеспячэння працоўных, сацыяльна-эканамічных правоў і інтарэсаў работнікаў і навучэнцаў, у тым ліку, у частцы, удзелу ў рэалізацыі канстытуцыйнага палажэння аб стварэнні неабходных умоў для рэалізацыі патэнцыялу моладзі ў інтарэсах усяго грамадства (ч. 1 арт. 32-1 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь).

Адпаведна, дзяржава не выступае і не павінна выступаць у якасці адзінага суб'екта рэалізацыі прынцыпаў сацыяльнай адказнасці, салідарнасці і сацыяльнай эфектыўнасці. Зыходзячы з выкладзенага, прапануецца дапоўніць пералік асноўных нацыянальных інтарэсаў у сацыяльнай сферы палажэннем аб удзеле прафесійных саюзаў і іншых грамадскіх фарміраванняў, якія з’яўляюцца ўдзельнікамі грамадзянскай супольнасці, у рэалізацыі сацыяльна значных задач, улічыўшы гэта ў п. 12 Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі.

Ва ўмовах існуючых знешніх і ўнутраных пагроз, перспектывы не толькі захавання, але і трансфармацыі традыцыйных каштоўнасных арыентацый і сацыяльных форм функцыянавання беларускага грамадства, роля і сацыяльнае значэнне навукі, несумненна ўзрастае, ва ўсёй разнастайнасці яе складнікаў, у тым ліку, не толькі галін навукова-тэхналагічнага характару, але і іншых, найперш навук гуманітарнага цыклу.

У гэтым кантэксце трэба адзначыць, што ў дзеючай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, замест выкарыстоўваемага ў ранейшай рэдакцыі паняцця бяспекі ў гуманітарнай сферы замацавана паняцце сацыяльнай бяспекі, якое, у параўнанні з ранейшым, больш шырокае па сваім аб’ёме [5, с. 259]. Адначасова, паняцце гуманітарнай бяспекі актыўна прысутнічае ў навуковых даследаваннях. У прыватнасці, аб гэтым сведчыць уключэнне ў пералік дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў на 2021 - 2025 гады ДПНД "Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы" (п. 12), якія зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27 ліпеня 2020 г., тым самым падкрэсліваецца роля гуманітарных навук у дачыненні адпаведных аспектаў нацыянальнай бяспекі.

Разам з гэтым, у Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі выкарыстоўваецца паняцце навукова-тэхналагічнай бяспекі, якая, згодна з п. 4, уяўляе сабой стан айчыннага навукова-тэхналагічнага і адукацыйнага патэнцыялу, які забяспечвае магчымасць рэалізацыі нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь у навукова-тэхналагічнай сферы. Такі падыход, як бачна, на практыцы трактуецца значна больш шырока. Акрамя таго, на нашу думку, гэта не ў поўнай меры адпавядае і нормам абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якія істотна павышаюць (наўпрост ці ўскосна) значнасць грамадскіх навук, у тым ліку, у сферы забеспячэння нацыянальнай бяспекі.

Сярод такіх канстытуцыйных норм можна адзначыць наступныя палажэнні, рэалізацыя якіх, павінна ажыццяўляцца з улікам выкарыстання набыткаў гуманітарных навук: аб ідэалогіі беларускай дзяржавы як аснове ажыццяўлення дэмакратыі (ч. 1 арт. 4 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь); захаванні гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны (ч. 2 арт. 15 Канстытуцыі Рэспублікі

Беларусь); садзейнічанне развіццю навуковых і тэхнічных даследаванняў, укараненню інавацый на карысць агульных інтарэсаў (ч. 4 арт. 51 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь); захаванні гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа, патрыятызме як абавязку кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь (ч. 2 арт. 54 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь). Адпаведна, прысутнічае неабходнасць выкарыстання замест паняцця навукова-тэхналагічнай бяспекі паняцця навуковай бяспекі, з яго легальным дэфенаваннем.

Падсумоўваючы адзначым, што ва ўмовах рэалізацыі ў заканадаўстве навэлаў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь асаблівую увагу трэба надаваць канцэптуальным дакументам. У гэтым кантэксце пры распрацоўцы праекту новай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі неабходна ўлічваць патэнцыял агульнага рэгулюючага ўздзеяння канстытуцыйных норм, якія замацоўваюць каштоўнасныя арыенціры развіцця грамадства і дзяржавы ў найбольш абагульненым выглядзе, роль навукі, якая, несумненна, з'яўляецца неабходным кампанентам забеспячэння нацыянальнай бяспекі ва ўсёй разнастайнасці яе складнікаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Вольфович: в новой Концепции нацбезопасности сохраняется преемственность [Электронный ресурс] // belta.by. – Режим доступа: https://www.belta.by/society/view/volfovich-v-novoj-kontseptsii-natsbezopasnosti-sohranjaetsja-preemstvennost-524636-2022/?utm_source=belta&utm_medium=news&utm_campaign=accent – Дата доступа: 01.11.2022.
2. Чуприс, О.И. Изменения и дополнения Конституции Республики Беларусь: олицетворение самобытности Основного Закона и обновленной государственности / О.И. Чуприс // Право.by. – 2022. - №2(76). – С. 5-13.
3. Миклашевич, П.П. Обновленная Конституция Республики Беларусь: сущностное содержание поправок / П.П. Миклашевич // Вестник Конституционного Суда Республики Беларусь. – 2022. – №2. – С. 5 – 34.
4. Василевич, Г.А. Новеллы белорусской Конституции как фактор устойчивого развития государства / Г.А. Василевич // Право.by. – 2022. - №2(76). – С. 14-23.
5. Малыхина, Г.И. Гуманитарная безопасность в структуре национальной безопасности Республики Беларусь / Г.И. Малыхина, В.И. Чуешов // Современный мир и национальные интересы Республики Беларусь : материалы междунар. науч. конф., Минск, 17 дек. 2021 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Е. А. Достанко (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2021. – С. 258-261. Современный мир и национальные интересы Республики Беларусь : материалы междунар. науч. конф., Минск, 17 дек. 2021 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Е. А. Достанко (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2021. – С. 258-261.